Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 11 (253) | Пятніца, 30 сакавіка 1956 года. | Цана 20 кап.

*Абмяркоуваем артыкул дацэнта А. С. Баркана*

## ВУЧЫЦЕСЯ ПЕДАГАГІЧНАМУ МАЙСТЭРСТВУ

У сувязі з надрукаванай у газеце «Беларускі універсітэт» заметкай дацэнта А. С. Баркана аб паляпшэнні сувязі студэнтау з вытворчасцю і з жыццём, мне, былому выпускніку фізмата універсітэта, хочацца выказаць некалькі прапаноу па гэтаму пытанню. Безумоуна, універсітэт дае глыбокія, зусім неабходныя для будучай работы, веды. Вельмі моцна памыляюцца тыя, хто думае, што у рабоце настауніка у школе гэтыя веды не спатрэбяцца і можна будзе абыйсціся без іх. Толькі яснае разуменне законау агульнай і тэарэтычнай фізікі дасць магчымасць праводзіць лекцыі на дастатковай навуковай вышыні, будаваць іх жыва і захапляюча, укладаючы у тлумачэнне глыбокі змест.

Але, калі тэарэтычная база, якая даецца універсітэтам, дастаткова моцная, то практычных навыкау, неабходных для работы настауніка-фізіка, універсітэт амаль не дае. Мы, выпускнікі, спачатку сваёй работы амаль не ведалі школьнага эксперымента, праводзілі урокі нясмела, а калі і хацелі паказаць той або іншы вопыт, то рабілі гэта вельмі прымітыуна, з некаторай баязлівасцю. На лекцыях па фізіцы ва універсітэце мы бачылі старанна падрыхтаваныя, добра афармленыя і пераканаучыя доследы. Але пры спробах зрабіць такі-ж дослед у школе часта цярпелі няўдачу. Трэба прама сказаць—нас гэтаму не вучылі. Невялікі курс методыкі фізікі носіць чыста тэарэтычны характар. Ва універсітэце, хаця-б факультатыуна, павінен чытацца курс методыкі школьнага эксперымента. Студэнты павінны вучыцца рабіць дэманстратыуныя доследы, рабіць прыборы, павінны умець паяць, працаваць па дрэву і па металу. Калі няма магчымасці паставіць такі курс, трэба арганізоуваць адпаведныя гурткі, прыцягваць студэнтау да падрыхтоукі лекцыйных дэманстрацый, даць ім больш самастойнасці пры выкананні лабараторных работ, шырэй выкарыстоуваць іх на вечарах фізічнага эксперымента для школьнікау.

Настаунік фізікі у школе абавязкова кіруе адным або нават некалькімі гурткамі. Навучэнцы хочуць вучыцца фатаграфаваць, манціраваць радыёпрыёмнікі, рабіць прыборы, хочуць ведаць фізіку шырэй і больш, чым ім патрабуецца па праграме. Ва усім гэтым школьнікам павінен дапамагчы настаунік. Выпускнік фізмата, безумоуна, павінен умець фатаграфаваць і ведаць элементы радыётэхнікі. На факультэце у гэтых адносінах ёсць вельмі вялікія магчымасці. Трэба, каб комсамольская арганізацыя факультэта узяла на сябе ініцыятыву шырокага разгортвання такой работы. Некалькі практычных урокау, якія даюць студэнты у час педпрактыкі, безумоуна, недастаткова, каб падрыхтаваць іх да работы настауніка. Студэнт павінен ведаць школу значна лепш і бываць з вучнямі больш, чым гэта можна рабіць на педпрактыцы. Чаму-б комсамольскай арганізацыі фізмата не узяць шэфства над адной або некалькімі школамі горада? Форм такой шэфскай работы вельмі многа. У школах патрэбны добрыя піонерважатыя, кіраунікі розных гуртку, школам трэба дапамагчы у комсамольскай рабоце, у арганізацыі радыёвузла, у правядзенні дадатковых заняткау і г. д. А ці-ж нельга было-б запрасіць вучняу падшэфнай школы для правядзення некаторых работ ва універсітэцкіх лабараторыях? Толькі такая пастаянная сувязь са школай можа забяспечыць сапрауднную падрыхтоуку настауніка. Мне, у заключэнне, хацелася-б сказаць студэнтам: «Часцей прыходзьце у школу. Дапамагайце прывіваць вучням любоу да фізікі і матэматыкі. Вучыцеся педагагічнаму майстэрству».

**М. А. ГОЛЬБЕРГ,**
**завуч 41-ай рускай школы г. Мінска.**

## ЮБІЛЕЙНАЯ ДАТА

Споунілася 60 год з дня нараджэння таленавітага беларускага пісьменніка К. К. Крапівы.

У чытальнай зале БДУ аформлена выстаука творау пісьменніка, якія вядомы не толькі у Беларусі, але і далека за яе межамі. Тут ёсць многа творау К. Крапівы, выдадзеных на рускай мове.

Ва універсітэце адбыуся вечар, на якім студэнты, выкладчыкі, аспіранты і супрацоунікі БДУ праслухалі лекцыю аб жыцці і творчай дзейнасці Кандрата Крапівы. Лекцыю прачытау аспірант В. Карабан.

**Б. ЧОРНЫ.**

# *ГРУПА—ЦЭНТР ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ*

★ ★

## Нашы задачы

Комсамольскі актыу хімічнага факультэта прыкладае усе намаганні, каб дапамагчы студэнтам накіраваць усе сілы на вырашэнне сваіх асноуных задач. На комсамольскіх сходах усё часцей ставяцца пытанні аб паспяховасці студэнтау, аб іх удзеле у грамадскіх мерапрыемствах.

Студэнты 4 курса не могуць зміріцца з адставаннем у вучобе Рудакоускай, а Стаускай пасля неаднаразовых папярэджанняу, яны вынеслі вымову. Рэзка асуджаны і іншыя комсамольцы, якія адстаюць і не жадаюць атрымаць дапамогу ад таварышау.

На факультэце выпускаецца лісток «Последние известия», дзе адлюстроуваюцца як недахопы, так і дасягненні у нашым жыцці.

Рэгулярна на факультэце працуюць харавы гурток, танцавальны і іншыя. Зараз ідзе падрыхтоука да агляду мастацкай самадзейнасці і да сустрэчы з выпускнікамі хімічнага факультэта універсітэта. Даволі часта праводзяцца лекцыі і даклады. З асаблівай цікавасцю былі праслуханы лекцыі «Аб дружбе і таварыстве» і «Штучныя спадарожнікі зямлі». Другакурснікі вельмі любяць культпаходы у тэатры і кіно. Добрым арганізатарам гэтых мерапрыемствау з'яуляецца Галя Бабрауніцкая.

Старанна працуюць над павышэннем спартыунага майстэрства спартсмены хімфака. Асабліва радуюць сваімі поспехамі Станішэускі, Сакольчык, Аколава, Міхалевіч. Мы змагаемся за прызавое месца у круглагадзічнай спартакіядзе.

**С. МЯЧКОЎСКІ,**
**член комсамольскага бюро хімфака.**

★ ★ ★

## ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА—СПРАВА ПЕРШАЧАРГОВАЯ

Комсамольская арганізацыя 2-га курса гістфака за апошні час прыкметна актывізавала палітыка-выхаваучую работу сярод студэнтау курса. Бюро курса (сакратар тав. Малевіч) арганізоувае мерапрыемствы, якія дапамагаюць студэнтам авалодаць ведамі. Так, у зімовую сесію усе комсамольцы курса здалі экзамены на «выдатна» і «добра». У гэтым нямалая заслуга комсамольскага бюро. Яно вяло барацьбу за высокаякаснае правядзенне семінарскіх і практычных заняткау, за сістэматычнае наведванне лекцый.

Разам з тым праводзіцца работа па арганізацыі культурнага адпачынку студэнтау. Быу правядзен вечар сумесна з першым курсам, які прайшоу вельмі цікава і весела. Асабліва трэба адзначыць добрую работу члена бюро К. Лешковай. Яна з'яуляецца добрым арганізатарам культпаходау студэнтау у кіно, на канцэрт-лекцыі, у музеі. Значную дапамогу у вывучэнні гісторыі культуры аказау культпаход у карцінную галерэю.

Пры дапамозе выкладчыкау комсамольскі актыу арганізавау вывучэнне матэрыялау XX з'езда на курсах. Студэнты курса актыуна удзельнічаюць у факультэцкім хоры і харэаграфічным гуртку.

**В. КОНАН,**
**член бюро II курса гістфака.**

## Умець праводзіць цікавыя мерапрыемствы

У гэтым годзе нашы 2 групы аб'еднаны у адну комсамольскую арганізацыю, што дало некаторыя станоучыя вынікі, а галоунае —ажывілася комсамольская работа. Усе пытанні вырашаюцца на агульных комсамольскіх сходах. Сходы, як правіла, праходзяць у нас актыуна. Гэтаму садзейнічае звычайна змястоуны і востры даклад. Асабліва удалымі у гэтых адносінах былі сходы—«Статут ВЛКСМ і яго выкананне», «Аб выніках зімовай сесіі».

Палітінфармацыі праводзяцца па групах, тут-жа вырашаюцца бягучыя пытанні кожнай групы. Часта даводзіцца слухаць скаргі на недысцыплінаванасць і агульную інертнасць групы. На шчасце, падобныя выпадкі у нас вельмі рэдка назіраюцца. У нас работа пастаулена так, што амаль усе нашы комсамольцы ахоплены даручэннямі. Многія па даручэнню райкома комсамола былі накіраваны у розныя комсамольскія арганізацыі горада для праверкі уплаты членскіх узносау у сувязі з абменам комсамольскіх білетау.

Нядауна у нас была арганізавана экскурсія на трактарны завод. Студэнты пазнаёміліся з вытворчасцю і засталіся вельмі задаволенымі. Намечана правесці экскурсіі і на іншыя прамысловыя прадпрыемствы горада.

Часта праводзяцца культпаходы у тэатр, кіно, але, нажаль, яшчэ ні разу не было абмеркавання прагледжаных спектакляу, фільмау. Хацелася-б, каб комсамольскае бюро факультэта, камітэт дапамаглі нам хаця-б адзін раз падрыхтаваць такое абмеркаванне.

Сумеснымі сіламі рыхтуецца мастацкая самадзейнасць да курсавых вечароу, якія праходзяць захапляюча і цікава. Вельмі удауся нам апошні вечар на тэму «Каханне, дружба, таварыства». Дацэнт Е. П. Ерэсь прачытала змястоуны даклад. У мастацкай самадзейнасці актыуны удзел прынялі комсамольцы Т. Сабаленка, М. Тамко, Г. Давыдчык, Т. Ярошка, І. Кавальчук і іншыя.

**В. ДОЛІЧ,**
**В. ЛЕМЦЮГОВА.**

*ЗАМЕТКІ АБ ПРАКТЫЦЫ*

## НА ПАРОЗЕ ЖЫЦЦЯ

Не без трывогі пераступілі мы парог школы № 33 гор. Мінска. «Як нас сустрэнуць?»—так думалі мы у гэты момант. Думалі не таму, што першыя самастойныя крокі заусёды бываюць цяжкімі. Гэта кожны з нас разумеу. Але мы не ведалі, як нас сустрэнуць настаунікі, вучні. І тут няма нічога дзіунага: мы упершыню з'яуляемся у школу не як навучэнцы, а як педагогі.

У першыя дні практыкі мы наведвалі многія класы. Асабліва прыглядаліся да класау, у якіх павінны былі даваць першыя урокі. З гэтай мэтай мы завялі спецыяльныя сшыткі-дзённікі, куды запісвалі свае назіранні, асобныя заувагі, думкі. Шмат нам дапамагло і тое, што мы перад першымі урокамі дзяжурылі у школьнай майстэрні. Тут мы больш блізка пазнаёміліся з вучнямі, а яны з намі. У той-жа час мы зауважылі, што не усе школьнікі добрасумленна працуюць. І гэта дало нам магчымасць зрабіць у далейшым вывад: той, хто абыякава адносіцца да працы, не лепш адносіцца і да вучобы.

Але гэта было яшчэ далека не усё. Самае цяжкае заставалася наперадзе. Мы добра усведамлялі, што першы урок—адказная справа, і ён патрабуе да сябе сур'ёзных адносін. Гэта добра разумеу і Леанід Яроцкі, які першы з усіх нас давау урок. Доуга і старанна рыхтавауся ён да гэтага важнага моманту у сваім жыцці. Леанід прачытау шматлікую метадычную літаратуру па рускай мове, прагледзеу пабочныя дапаможнікі, параіуся з метадыстам Дзіанай Пятроунай Багровай, самастойна падрыхтавау наглядны дапаможнік-табліцу. Гэтаму-ж прыкладу паследавау і я, напісаушы табліцу «Правописание частицы «не» с существительными и прилагательными».

...Урок закончан. Пачалося абмеркаванне. Было адзначана, што усе моманты урока прайшлі чотка і арганізавана. У той-жа час была звернута увага на тое, што Яроцкі у час замацавання новага матэрыялу хадзіу па класу. Гэтым самым ён перашкаджау вучням сачыць за дошкай. У далейшым гэтага недахопу за ім не назіралася. Наадварот, назіралася у некаторых з нас прыкованасць да аднаго месца. Гэта можна аднесці і да мяне, калі пры апытванні я увесь час сядзеў, што з'яуляецца метадычна няправільна, бо цяжка сачыць за класам.

Наступныя урокі нашай групы прайшлі больш паспяхова. Памылкі Яроцкага былі улічаны і не паутараліся. Затое выявіліся іншыя недахопы, у прыватнасці, мне была зроблена заувага. Аб ёй трэба сказаць.

Першы урок я давау па рускаму чытанню у шостым класе. Галоуны мой недахоп выявіуся у час тлумачэння. Расказвау я аб жыцці і творчасці Н. В. Гогаля. Матэрыял добра падрыхтавау, але пачау расказваць манатонна і ціха. І гэта манатоннасць у маім расказе адчувалася да сярэдзіны тлумачэння. Як было адзначана на абмеркаванні, я баяуся адарвацца ад канспекта.

У 9 класе па беларускай літаратуры наша група дала тры урокі. На іх высветлілася, што аднаго ведання матэрыялу яшчэ недастаткова. Так, на сваіх заліковых уроках Яроцкі і Явід недаацанілі выразнага чытання урыукау з паэмы Якуба Коласа «Рыбакова хата». Вынікам з'явілася тое, што агульнае уражанне аб іх уроках значна знізілася, хаця яны і былі дадзены метадычна правільна. Тут-жа трэба адзначыць нездавальняючае тлумачэнне новага матэрыялу Марыяй Явід. У яе голасе адчувауся нейкі сум. Аб гэтым-жа гаварыу і выраз яе твару. Таварышы зрабілі заувагу, і у далейшым яна гэтага недахопу пазбегла.

Агульным недахопам урокау, дадзеных намі па беларускай мове, з'яуляецца тое, што мы не заусёды выпраулялі у адказах вучняу рускія словы. Тут выявілася наша павольнасць у перакладзе рускіх слоу на беларускую мову. Таму нам, ды і усім тым, каму прыдзецца выкладаць беларускую мову і літаратуру, патрэбна звярнуць асаблівую увагу на слоунікавы запас сваёй мовы.

З вялікай цяжкасцю мы сустрэліся у час праверкі сшыткау. Здавалася, што тут асаблівага—праверыу, паставіу адзнаку і усё добра. Але гэта не так. Сшыткі у нас адымалі многа часу. Тут высветлілася, што нашы веды па граматыцы не зусім дастатковыя. Даводзілася зноу садзіцца за граматыку, паутараць тое ці іншае правіла. А выпрауляючы памылкі, не заусёды былі упэунены у правільнасці выпраулення. Таму даводзілася раіцца адзін з адным, заглядаць у слоунікі.

Што датычыцца школьных або класных мерапрыемствау, то яны рознастайныя і цікавыя. Так, нядауна мы прынялі удзел у фестывалі піонерау школы на тэму «Дети разных народов, мы мечтою о мире живём». На фестываль намі былі запрошаны студэнты,—прадстаунікі брацкай Польшчы,—якія займаюцца у нашым універсітэце. У фестывалі прынялі удзел таксама і прадстаунікі Кітая і Балгарыі. Перад сабраушыміся яны выступілі і расказалі аб жыцці школьнікау і моладзі у сваіх краінах. Пасля адбыуся канцэрт мастацкай самадзейнасці, які прайшоу з вялікім поспехам.

Наша практыка цягнулася пяць тыдняу, і за гэты час мы далі па пяць заліковых урокау. Кожны з нас, акрамя заліковых, дау яшчэ самастойна па 4—5 урокау без метадыста і настауніка. Гэтыя урокі паказалі, што аднаму у класе намнога цяжэй даваць урокі. Тут не толькі трэба правесці чотка усе моманты урока, але і нільна сачыць за дысцыплінай. Зыходзячы з гэтага, трэба пажадаць, каб кафедра педагогікі у будучым планавала для студэнтау-практыкантау не толькі заліковыя, але і самастойныя урокі. Яшчэ лепш, каб практыкантам дазвалялася выкладаць мову і літаратуру, акрамя заліковых урокау, на працягу тыдня у адным класе.

**І. СТРАЖЭВІЧ,**
**студэнт IV курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.**

# НА ЮРЫДЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

## Вышэй узровень комсамольскай работы

Комсамольская арганізацыя юрыдычнага факультэта налічвае звыш 220 чалавек. Гэта вялікая арганізацыя, здольная выконваць вельмі сур'ёзныя задачы. Аднак у яе рабоце да самага апошняга часу назіраліся вялікія недахопы, якія адносяцца, галоўным чынам, да пастаноўкі ідэйна-выхаваўчай і культурна-масавай работы на факультэце.

Аб гэтым сведчаць застаўшыяся ва ўсіх у памяці неаднаразовыя выпадкі амаральных учынкаў некаторых студэнтаў факультэта, якія ганьбяць увесь універсітэт і аб якіх у свой час так многа гаварылі.

Партыйная і комсамольская арганізацыі прарабілі вялікую работу ў гэтым напрамку і дабіліся некаторых поспехаў. Ёсць поспехі і ў галіне паляпшэння паспяховасці студэнтаў. Але ў іншых пытаннях, на якія не было звернута належнай увагі, да самага апошняга часу ўсё было па-старому, гэта значыць, амаль поўнасцю пушчана на самацёк.

Асабліва яскрава выявілася гэта на адкрытым партыйным сходзе, прысвечаным стану комсамольскай работы на факультэце.

Незадоўга перад сходам было праведзена расшыранае пасяджэнне партыйнага, комсамольскага і прафсаюзнага бюро па гэтаму пытанню.

На пасяджэнні і адкрытым партыйным сходзе быў выяўлен цэлы шэраг недахопаў у рабоце комсамольскай арганізацыі. Якія-ж гэта недахопы? Першы і самы галоўны заключаецца ў тым, што партыйная арганізацыя не ўдзяляла належнай увагі рабоце з комсамолам. Справа не ў тым, што з боку партыйнага бюро не даваласяпарад і ўказанняў. Гэта было, але гэтым па сутнасці справы амаль і абмяжоўваўся ўплыў партыйнай арганізацыі на комсамольскую.

Што датычыцца штодзённай арганізацыйнай работы, дык яна вялася ад выпадку да выпадку і насіла характар штурмаўшчыны.

Другім недахопам, які адносіцца ўжо непасрэдна да работы комсамольскай арганізацыі факультэта, з'яўляецца вялікая інертнасць часткі комсамольцаў, іх абыякавыя адносіны да грамадскага жыцця на факультэце. Іменна таму, што гэтыя комсамольцы не маюць ніякіх грамадскіх даручэнняў, усякае грамадскае мерапрыемства вельмі цяжка правесці.

Абсалютна недапушчальная абыякавасць студэнтаў-комсамольцаў да выканання сваіх непасрэдных комсамольскіх абавязкаў не турбавала аднак да гэтага часу комсамольскую арганізацыю, яе бюро.

Гэта прывяло да заняпаду грамадскай работы, многія комсамольцы лічылі сябе поўнасцю выканаўшымі свае абавязкі пасля ўплаты членскіх узносаў. Як вынік, вельмі мала комсамольцаў прымала ўдзел у спартыўнай рабоце, у мастацкай самадзейнасці і г. д.

Пасля партыйнага сходу, у рашэнні якога былі намечаны канкрэтныя меры па ліквідацыі адзначаных вышэй і многіх іншых недахопаў, справа крыху палепшылася, але яшчэ далёка не так, як трэба.

Амаль ранейшым застаецца становішча ў групах з наведваннем заняткаў, з падрыхтоўкай да практычных заняткаў. Комсамольскія арганізацыі груп недастаткова рэагуюць яшчэ на пропускі заняткаў і факты адмоў асобных студэнтаў адказваць на пытанні выкладчыка на семінарскіх занятках. Прымушае яшчэ чакаць многа лепшага той уплыў, які павінны аказваць студэнты-комуністы на сваіх таварышаў-комсамольцаў.

Вельмі многа недахопаў ёсць і ў рабоце мастацкай самадзейнасці. Але, як становучы вынік праведзенай работы, трэба адзначыць тое, што і партыйная і комсамольская арганізацыі, выявіўшы недахопы ў сваёй рабоце і звярнуўшы на іх належную ўвагу, сумесна пачалі барацьбу з імі.

У прыватнасці, рашэннем партыйнага сходу намечан агульнафакультэцкі комсамольскі сход з удзелам комуністаў і выкладчыкаў з абмеркаваннем пытання работы лепшай комсамольскай групы універсітэта. Нягледзячы на тое, што сакратар комсамольскага камітэта БДУ тав. Бабосаў і яго намеснік тав. Салашэнка прысутнічалі на сходзе, становучай работы ў гэтым напрамку яшчэ не праведзена.

У павышэнні стану работы комсамольскай арганізацыі факультэта мы разлічваем на дапамогу з боку партыйнага і комсамольскага камітэтаў БДУ.

Партком БДУ павінен аказаць нам дапамогу ў арганізацыі радыёвузла з мэтай рэгулярных выпускаў радыёгазеты. Гэта зрабіць няцяжка, бо асноўныя часткі радыёвузла ёсць, патрэбен толькі мікрафон.

Трэба спадзявацца, што сумеснымі намаганнямі партыйнай і комсамольскай арганізацый калектыву факультэта ўдасца падняць стан комсамольскай работы на новую вышэйшую ступень.

**В. МАТУСЕВІЧ,**
**сакратар партбюро юрфака.**



*Студэнтка III курса юрыдычнага факультэта М. Катлярова перад пачаткам лекцыі «запусціла» ў паветра скамячаную газету.*

*Пяціхвілінны палёт газеты ў паветранай прасторы аўдыторыі суправаджаўся грукатам сталоў і стулаў.*

## НЕ ЗРАБІЛІ ВЫВАДАЎ З МІНУЛАГА

Зімовая экзаменацыйная сесія прайшла на І курсе юрыдычнага факультэта далёка не бліскуча. Было некалькі правалаў, многія студэнты (больш 20 працэнтаў) не дабіліся права атрымліваць стыпендыю, зусім мала было выдатных адказаў.

Здавалася, што ўсё гэта павінна было прымусіць першакурснікаў сур'ёзна задумацца і па-сапраўднаму ўзяцца за вучобу ў другім семестры. Але, на жаль, нічога не змянілася. На зыходзе другі месяц новага семестра, а многія студэнты І курса, якія дрэнна адказвалі на экзаменах зімой, не селі яшчэ за кнігу, а працягваюць чагосьці чакаць.

Да чаго гэта прыводзіць, сведчаць семінарскія заняткі, якія ў бягучым паўгоддзі яшчэ ні разу мяне не задаволілі. Прычына толькі адна—студэнты да іх не рыхтуюцца, не вывучаюць глыбока рэкамендаваную па тэме літаратуру. А калі студэнты прыходзяць на заняткі без ведання матэрыялу, яны не ў стане добра выступіць, паспрачацца паміж сабой, ды і наогул ніякага семінара не атрымаецца. Па тэме «Судовая рэформа 1886 года», якую мы цяпер вывучаем, быў рэкамендаван захапляючы артыкул В. І. Леніна «Бей, но не до смерти». Без гэтага артыкула нельга зразумець сутнасць названай рэформы і прычыны адмовы ад яе прынцыпаў у гады рэакцыі. І што-ж высветлілася на семінарскіх занятках? Мала хто прачытаў гэты артыкул, спасылаючыся на тое, што «не ўдалося» дастаць адпаведны том твораў В. І. Леніна, а тыя студэнты, якія прачыталі, не заўважылі глыбокай думкі, якая ў артыкуле заключаецца. І не заўважылі яны таму, што толькі прачыталі, але не вывучылі артыкул.

Не лепш абстаіць справа і з выкананнем курсавых работ. Давялося затраціць многа энергіі, каб дабіцца сустрэчы са студэнтамі з мэтай аказаць ім дапамогу ў складанні планаў курсавых работ, у падборы літаратуры і г. д. Многія ўпорна не прыходзілі на кансультацыю. Асобныя-ж студэнты (Адашкевіч, Сучок) і да гэтага не знайшлі часу, каб сустрэцца са мной. А тэрмін-жа прадстаўлення курсавых работ ужо на насу.

**Б. БАБІЦКІ,**
**дацэнт.**



*Чыста і ўтульна ў пакоі № 38 інтэрната па вуліцы Кірава, дзе жывуць студэнткі IV курса юрыдычнага факультэта. (староста—Сухадольская). Дзяўчаты любяць вечарамі пасля заняткаў пагутарыць аб справах на факультэце, пачытаць мастацкую літаратуру, абмеркаваць прачытанае.*

**Фото Э. ДАМАРАЦКАГА.**

## ДА АГЛЯДУ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Да прадстаячага агляду мастацкай самадзейнасці студэнты юрыдычнага факультэта рыхтуюцца з усёй адказнасцю. Гэты агляд з'явіцца вынікам работы калектываў самадзейнасці універсітэта і, у прыватнасці, нашага факультэта.

З чым-жа мы падыйдзем да агляду?

Хор пад кіраўніцтвам І. І. Майсеянкі (студэнт IV курса) выканае некалькі рускіх народных песен, «Студенческую песню» з кінофільма «Поезд идет на Восток». Танцкалектыў рыхтуе народныя танцы «Лявоніху, «Малдаванеску» і інш. Трэба адзначыць кіраўніка гэтага калектыва студэнта II курса Бірукова, як умелага арганізатара. Актыўны ўдзел у танцавальным гуртку прымаюць студэнты Нарановіч, Сідарэнка, Гарбачоў і інш.

Драматычны калектыў пакажа аднаактныя п'есы День рождения» Морозовой и «Дело Рогозина» Эвальда.

Акрамя таго, студэнты Каптураў, Закарчук, Панамароў, Адашкевіч выступяць з мастацкім чытаннем.

**Р. КАЧАТКОВА,**
**А. ЦЯН,**
**студэнты юрфака.**

*Пісьмо ў рэдакцыю*

## Замест кабінета... машыннае бюро

У нас на факультэце маецца некалькі добра абсталяваных кабінетаў, у якіх ёсць уся неабходная літаратура і рад іншых вучэбных дапаможнікаў.

Як вядома, кабінеты прызначаны для таго, каб студэнты маглі плённа займацца там. Але, на жаль, атрымоўваецца інакш. Калі ўзяць, напрыклад, кабінет замежных моў, то ўмовы там далёка неспрыяльныя для заняткаў. Праўда, там маецца ўся неабходная літаратура, якой не знойдзеш у бібліятэцы, але там пастаянна трашчаць пішучая машынка. Па сутнасці, кабінет замежных моў у нас ператварылі ў нейкае машыннае бюро. І замест таго, каб выкарыстаць час на падрыхтоўку да прадстаячай сесіі, студэнты вымушаны бегаць па корпусу і шукаць іншыя месцы для падрыхтоўкі замежнай мовы.

Стварыць у кабінетах усе ўмовы для пленнай работы—першачарговая задача.

**СУХАВЕРХІ,**
**ТРАЦЭЎСКІ,**
**ЖУРАЎЛЕЎ,**
**студэнты І курса юрфака.**

## „Я сёння чысценькая?“

Раздаецца званок. У аўдыторыю заходзіць дацэнт Барыс Еўсеевіч Бабіцкі. У студэнтаў першага курса юрыдычнага факультэта лекцыя па гісторыі дзяржавы і права СССР. Лектар даходліва, зразумела, з любоўю выкладае матэрыял: «Дзяржава і права ў перыяд імперыялістычнай вайны і лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі». Большасць першакурснікаў схіліліся над канспектамі, уважліва слухаючы і канспектуючы лекцыю.

Пройдзе яшчэ некалькі часу і наступіць адказны перыяд—летняя экзаменацыйная сесія. Здаць яе толькі на «выдатна» і «добра»—такое жаданне студэнтаў першага курса.

Дасягнуць выдатных ведаў можна толькі тады, калі студэнты ўважліва будуць слухаць лекцыі, добра рыхтавацца да практычных заняткаў, як і робяць большасць студэнтаў. Але ёсць асобныя таварышы, якія гэтага яшчэ не разумеюць. Вось у перадапошнім радзе сядзяць дзве студэнткі. Адклаўшы канспект, Макарэнка піша запіску сваёй суседцы Дзяргуновай. Іх захапляе гэтая ручная пошта, і ўжо вырашыўшы «набалеўшае» для Макарэнка пытанне шляхам абмену запіскамі, дзяўчаты пераходзяць да новай тэмы:

— Я сёння чысценькая?—пытаецца Дзяргунова ў сяброўкі. Што адказала ёй Макарэнка—невядома. Але гэты факт гаворыць аб тым, што побач з добрым на першым курсе нараджаецца і дрэннае з боку асобных студэнтаў.

Комсамольскай арганізацыі, актыву курса неабходна з самага пачатку павесці барацьбу з такога роду праявамі абыякавых адносін да заняткаў з боку асобных студэнтаў.

**В. ДРАГУНОЎ.**

## У КАБІНЕТАХ

Кабінеты адыгрываюць важную ролю ў паспяховай падрыхтоўцы студэнтаў да сесіі.

Мы пабывалі ў некалькіх кабінетах факультэта.

Вось кабінет асноў марксізма-ленінізма і палітэканоміі. Нас сустракае лабарант кабінета Р. З. Ханіна, якая працуе тут з 1954 года. Схіліўшыся над кнігамі і канспектамі, удумліва працуюць студэнты. У кабінеце ўтульна, чыста, на вокнах—кветкі.

— Рахіль Залманаўна, раскажыце, калі ласка, аб рабоце кабінета,—звяртаемся мы да Ханінай.

— Што-ж расказваць, — усміхаецца яна,—у нас таксама, як і ва ўсіх кабінетах: прыходзяць студэнты, бяруць літаратуру, рыхтуюцца.

Але ёсць штосьці своеасаблівае ў рабоце кабінета. Гэта адчуваецца, калі толькі пераступіш парог кабінета: клопаты аб студэнтах, імкненне стварыць ім найлепшыя ўмовы для працы. І студэнты любяць гэты кабінет. Тут можна заўсёды дастаць патрэбную літаратуру, атрымаць планы семінарскіх заняткаў, добра папрацаваць.

— Наш кабінет студэнты называюць ціхім кутком,—расказвае Рахіль Залманаўна,—тут нішто не перашкаджае ім займацца.

І сапраўды, колькі-б ні было ў кабінеце студэнтаў, тут заўсёды ціха.

Мы наведалі таксама кабінет грамадзянскага права і працэсу. Тут старшай лабаранткай працуе Тамара Аляксееўна Чарнабай. Яна расказала, што ў кабінеце часта праводзяцца кансультацыі для студэнтаў. Так, нядаўна была праведзена кансультацыя па грамадзянскаму праву выкладчыкам П. І. Гаузе, па калгаснаму праву—выкладчыкам В. Ф. Чыгір і інш.

Але ёсць тут і недахопы, якія дрэнна адбіваюцца на рабоце.

Кабінет вельмі дрэнна забяспечан нагляднымі дапаможнікамі. Нават тыя, якія маюцца, патрабуюць замены новымі. Сваімі сіламі работнікі кабінета гэтага зрабіць не могуць, а кафедра грамадзянскага права і працэсу ў гэтым напрамку нічога не робіць.

У кабінеце тэорыі гісторыі дзяржавы і права мы засталі Ніну Яфімаўну Лях—лабарантку. Цяпер якраз настаў перыяд напісання і здачы курсавых работ. У кабінеце тэорыі гісторыі дзяржавы і права і дзяржправа студэнты могуць пазнаёміцца не толькі з тэмамі курсавых работ, але і са спісам неабходнай літаратуры да кожнай тэмы.

Амаль кожны дзень у кабінеце выкладчыкамі праводзяцца кансультацыі па розных дысцыплінах.

**А. ДЗЯТЛАЎ.**

**Старонку арганізавалі студэнты аддзялення журналістыкі В. Душкевіч, А. Дзятлаў, В. Драгуноў, Э. Дамарацкі, Н. Гілевіч.**

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# ПАРТБЮРО І КОМСАМОЛ

Ці працуе партыйнае бюро філалагічнага факультэта з комсамольскімі арганізацыямі, ці цікавіцца іх работай і жыццём? Безумоуна. Дастаткова бегла пазнаёміцца з пратаколамі пасяджэнняу бюро і вам нават давядзецца папракнуць сябе за пастаноуку пад сумненне гэтага пытання.

Кірауніцтва комсамолам з боку партыйнай арганізацыі ажыццяуляецца тут у розных формах. У прыватнасці практыкуецца заслухоўванне комсоргау на пасяджэннях партыйнага бюро. Звычайна выбіраюцца тыя курсы, дзе становішча спраў выклікае трывогу. Ужо у бягучым годзе заслухана справаздача сакратара комсамольскага бюро 3-га курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры тав. Маслоўскага. Перш чым паставіць пытанне на абмеркаванне некалькі комуністау падрабязна азнаёміліся з работай гэтай арганізацыі: гаварылі з комсамольцамі, прысутнічалі на семінарскіх занятках, выяўлялі прычыны недахопау і шляхі іх выпраулення. За тым сабралося партыйнае бюро, абмеркавала становішча спрау у комсамольскай арганізацыі і прыняло адпаведнае рашэнне.

Многа на філалагічным факультэце ды і ва усім універсітэце гавораць аб аддзяленні журналістыкі. Тут нізкая вучэбная дысцыпліна. Бываюць выпадкі масавага зрыву лекцый, амаральных паводзін асобных студэнтау. З такім становішчам, вядома, мірыцца нельга. Пагэтаму партыйнае бюро факультэта рашыла вынесці пытанне аб рабоце комсамольскай арганізацыі аддзялення журналістыкі на адкрыты партыйны сход. Спецыяльная камісія з пяці комуністау, узначальваемая членам партбюро тав. Пауленка, больш месяца знаёмілася з кожнай студэнцкай групай, цікавілася іх акадэмічнай, масава-палітычнай і культурнай работай. 8 сакавіка на адкрытым партыйным сходзе з дакладам аб рабоце комсамольскай арганізацыі аддзялення журналістыкі выступіу сакратар комсамольскага бюро тав. Мацкевіч. Комуністы і комсамольцы, выступіушыя у спрэчках, ускрылі шэраг недахопау, іх прычыны, падказалі, якія мерапрыемствы патрэбна правесці, каб дабіцца павышэння паспяховасці і умацавання дысцыпліны студэнтау.

Цесную сувязь з комсамольскімі арганізацыямі і кірауніцтва імі партбюро ажыццяуляе праз выкладчыкау, замацаваных за асобнымі студэнцкімі групамі. Па-першае, яны заусёды прысутнічаюць на комсамольскіх сходах курсау, ведаюць, што там добра і што дрэнна, у чым патрэбна дапамога. Па-другое, своечасова даводзяць да ўвагі комсамольцау тыя мерапрыемствы, якія намячаюць дэканат і партыйная арганізацыя для павышэння паспяховасці і дысцыпліны студэнтау.

На комсамольскіх сходах курсау, прысвечаных абмеркаванню вынікау прайшоушай зімовай экзаменацыйнай сесіі, з дакладамі выступалі не студэнты, а выкладчыкі, адказваючыя за палітычна-выхавауч ую работу ў групах. Гэта зроблена па рашэнню партыйнага бюро з мэтай найбольш аб'ектыуна і сур'ёзна праанализаваць становішча паспяховасці і дысцыпліны на кожным курсе ї тым самым паспяхова ліквідаваць тыя памылкі, якія дапусціла комсамольская арганізацыя у сваёй рабоце.

І усё-ж работа партбюро з комсамолам часта не дасягае мэты. Здараецца гэта таму, што многія яго рашэнні і мерапрыемствы не даводзяцца да канца, што кірауніцтва комсамольскімі арганізацыямі ажыццяуляецца у асноуным на сходах і пасяджэннях, а не канкрэтна і штодзённа.

Ужо гаварылася, што партбюро заслухала на сваім пасяджэнні сакратара комсамольскага бюро 3-га курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры і прыняло рэзалюцыю. Прыняло... і забылася. Ніхто з членау партбюро не прышоу нават на абмеркаванне рэзалюцыі на комсамольскім сходзе. Пагэтаму невядома, як успрынялі комсамольцы рашэнне аб іх рабоце, згодны яны з ім ці не, ці правільна зразумелі яго. Выходзіць, што рашэнне прынялі для простай адпіскі.

Абмеркавана пытанне на партыйным сходзе аб рабоце комсамольскай арганізацыі аддзялення журналістыкі. Ускрылі недахопы. І вось у рашэнні не запісана ніводнага больш-менш канкрэтнага пункта, а іх дзевяць. Больш таго, хутка заканчваецца навучальны год, а рэзалюцыя партыйнага бюро яшчэ не абмяркоуваецца у студэнцкіх групах. Атрымліваецца, што сабіраліся, гаварылі, спрачаліся, і толькі.

Партыйнае бюро не заусёды прыслухоуваецца да голасу комсамольцау. На чацвертым курсе аддзялення журналістыкі тры гады ужо гавораць, што у іх ёсць студэнты, якія дрэнна вучацца, не выконваюць грамадскіх даручэнняу, з якіх ніколі не выйдзе журналістау. Іх крытыкуюць на кожным сходзе. Некалькі разоу напаміналі дэканату і членам партбюро, што гэтых студэнтау трэба перавесці на завочны факультэт ці на другое аддзяленне. І усё гэта дарэмна. Комсамольцам не ідуць насустрач. Двух студэнтау з таго-ж курса тт. Чымірку і Георгіева нядауна выключылі з універсітэта. А гэтага, магчыма-б і не здарылася, калі-б партбюро раней узялося за іх выхаванне. Сігналы аб іх дрэнных паводзінах былі вядомы партбюро у самым пачатку навучальнага года.

Комсамол філалагічнага факультэта можа стаць надзейным памочнікам дэканата і партыйнай арганізацыі у барацьбе за трывалыя веды і прыкладныя паводзіны студэнтау, калі яму будзе аказвацца штодзённая канкрэтная дапамога з боку партбюро, калі апошняе будзе прыслухоувацца да голасу комсамольцау.

**В. КАЛЕНЧЫЦ.**




## СЛОВЫ І СПРАВЫ

На пасяджэнні комсамольскага бюро юрыдычнага факультэта многа гаварылася аб тым, што не удзяляецца увагі групоргам. На днях адбыуся семінар групоргау, але прадстаунікі юрфака чамусьці не палічылі патрэбным пабываць на ім.



*Не вучаць нас!*
*Не знаем мы работы!*
*. . . . . . . . . . . . . .*
*А тут сядзець*
*Няма, чамусь, ахвоты...*

## РЭЖКЕВІЧ, СОН І ЛЕКЦЫІ

Студэнт III курса аддз. матэматыкі Рэжкевіч любіць паспаць і пагэтаму вельмі часта спазняецца на лекцыі.



*Да васьмі яму не узняцца,*
*Хоць пад'ёмны-б кран наняць.*
*Перш за усё—яму-б наспацца,*
*А занятк і?—наплявацъ!*

## НЕ ХАПАЕ МУЖНАСЦІ І ДРУЖНАСЦІ

На II курсе гістарычнага факультэта ужо некалькі разоу адкладваюць дыспут па кнізе В. Кетлінскай «Мужнасць».



*Дауно ідуць тут дыспуты,*
*Як ім на дыспут выступіць.*
*Ды павуціннем дружнасць іх*
*Пакрыта разам з «Мужнасцю»*

## ПРА ДУШ

Стаялі халодныя лістападаускія дні. Дробны, непрыемны дождж ык стукау па вакну адміністрацыйна-гаспадарчай часткі. Вецер ганяу па тратуарах кучы пажоуклых лісцяу. Гучалі заключныя акорды восені...

Супрацоунікі адміністрацыйна-гаспадарчай часткі стаялі каля акна і глядзелі на універсітэцкі скверык. Там па дарожках, распырскваючы лужыны, бегалі спартсмены. Скверык і спартсмены мелі невясёлы выгляд (магчыма, у гэтым было вінавата памутнеушае ад дажджу аконнае шкло). Сярод супрацоунікау час-ад-часу чуліся уздыхі.

— Небаракі,—сказау адзін з іх, напэуна намякаючы на спартсменау.—Як яны бегаюць пад такім дажджом?

—Што там бегаюць...—адгукнууся другі.—А вось, як яны сядзяць на лекцыі...

— А што?

— Ды ім-жа няма дзе памыцца пасля трэніровак. Душа-ж няма. А слухаць лекцыі бруднаму, потнаму вельмі непрыемна...

— Та-ак,—працягнуу работнік з многаабяцаючым позіркам. — Душ патрэбен. Аб гэтым пісала нядауна наша шматтыражка. Толькі я думаю, што спяшацца з гэтай справай пакуль не трэба. Скора зіма. Не будзе бруду. На холадзе людзі не пацеюць. А пасля Новага года мы што-небудзь прыдумаем...

Беглі дні. Прайшоу снежань, адсвяткавалі супрацоунікі Новы год, непрыкметна праляцеу студзень, за ім—люты. Прышоу сакавік.

І неяк зноу супрацоунікі адміністрацыйна-гаспадарчай часткі сабраліся разам.

Па-вясенняму лёгкі ветрык рабаціу ваду у лужынах, цяклі ручайкі, весела шчабяталі вераб'і.

Падставіушы цёпламу сакавіцкаму сонцу твары, нашы гаспадарнікі прагульваліся каля універсітэта. І сонца, і ручайкі, і вераб'і—усё уміляла іх; і, магчыма, гаспадарнікі і не успомнілі-б аб душы, калі-б ім на вочы не папауся спартсмен. Потны і мокры, ён прабег міма іх і знік у хімкорпусе.

Супрацоунікі разгублена пераглядзелі адзін на аднаго. Некалькі хвілін маучалі. Пасля адбылася такая гутарка.

— А душа мы так і не пабудавалі... Спартсмены па-ранейшаму мыюцца пад кранам.

— Та-ак. Гэта наш промах. Ці-ж ёсць сэнс што-небудзь рабіць цяпер? Скора лета. Летам, памойму, халодная вада з-пад крана куды прыемней, чым гарачая з душа...

— Правільна, душ летам не патрэбен, а да зімы мы што-небудзь прыдумаем...

На гэтым гутарка абарвалася.

Можна толькі дадаць, што душ спартсмены могуць бачыць хіба ў сне, а у сапрауднасці ім даводзіцца абмывацца вадой з-пад крана. Да наступнага лета адміністрацыйна-гаспадарчая частка можа толькі прапанаваць прыкладна такі праект душа, які могуць ажыццявіць і самі спартсмены. (глядзі малюнак унізе).

**А. КІЙРАНЕН.**



### Паважаны Вожык!

*Ты ведаеш, што зараз у прыродзе наступіла вясна. Ажывіліся рэчкі, пацяклі ручайкі, абудзіўся лес, высока у небе заліваюцца жаваранкі...*

*Ты спытаеш, для чаго гэта я табе ўсё пішу: «ажывіліся рэчкі» «абудзіуся лес» і г. д. А вось для чаго. Справа у тым, што у прыродзе усё абудзілася, ажыло, а вось у нашай бухгалтэрыі атрымалася наадварот. З прыходам вясны ўсё пачало заміраць. Узяць хаця-б тое, як яна выдае стыпендыю студэнтам. Калі зімой мы атрымлівалі стыпендыю больш-менш рэгулярна, то зараз аб гэтым можна толькі марыць. Зайшлі мы 24 сакавіка у бухгалтэрыю, ну, думаем, атрымаем. Нам гавораць «пачакайце». Зайшлі 26-га—«пачакайце», 27-га—«пачакайце». І вось так ужо чакаем некалькі дзён.*

*Дапамажы нам, сябра Вожык. Зайдзі у бухгалтэрыю, калі ласка, ды пашавялі яе работнікау сваімі калючкамі. Магчыма тады мы будзем своечасова атрымліваць стыпендыю.*

**Група стараст.**

*Агляд друку*

## ЗА ДРЭВАМІ НЕ БАЧАЦЬ ЛЕСУ

«...Делать пироги из грязи, глины и строительных материалов навсегда возбраняется.

По положении начинки и удобрении оной должным числом масла и яиц, клади пирог в печь и содержать в вольном духе, доколе не зарумянится».

Чытач, напэуна, памятае па «Гісторыі аднаго горада» шчэдрынскага Феафілакта Ірынаркавіча Беневоленскага, які і склау гэты статут па выпечцы пірагоу. Нешта падобнае знаходзім мы паміж густам Беневоленскага і рэдкалегіяй насценгазеты «За культуру в быту» (орган студкома інтэрната па вул. Кірава). Прауда, не трэба думаць, што апошняя склала якія-небудзь там статуты па выпечцы пірагоу ці чаго іншага. Не. Будзем спадзявацца, што і у далейшым яна ніколі гэтага не дапусціць. Але-ж варта пазнаёміць нашых чытачоу з некаторымі матэрыяламі газеты.

Перад намі пяты нумар. У вочы кідаецца артыкул пад загалоукам «Староста комнаты», дзе чытаем, што у кожным пакоі з ліку пражываючых там студэнтау выбіраецца староста, на якога ускладваецца уся адказнасць за чыстату і падтрыманне парадку. Далей гаворыцца, што староста назначае дзяжурных і сочыць за тым, як яны выконваюць свае абавязкі. У такім-жа духу вытрыман амаль увесь артыкул і толькі у самым канцы гаворыцца, што старасты 4-га і 27-га пакояу не адпавядаюць таму, каб далей заставацца на гэтай пасадзе.

Яшчэ большую цікавасць з узятага пункту гледжання прадстауляе заметка «Об обязанностях дежурного», што змешчана у тым-жа нумары. Тут зноу-такі пералічваюцца усе абавязкі, якія ускладаюцца на дзяжурнага па пакою. Аутар так захапіуся тэмай, што у канцы напісау: «Полная приборка заключается в тщательном подметании пола, и не один раз в сутки, как это делается во многих комнатах. Дежурный протирает пыль со всей мебели— шкафа, стола, коек, стульев, вешалок. Должны протираться чемоданы и окна...»

Аналагічных матэрыялау у газеце нямала. З усіх нумарау, выпушчаных з пачатку навучальнага года, вее павярхоунасцю, слабым унікненнем ва усе надзённыя пытанні студэнцкага быту. У многіх заметках рэдкалегія не ідзе далей агульных разважанняу. Амаль у кожным нумары па некалькі разоу можна сустрэць такія фразы:

«Всем известно, что чистота является залогом здоровья...»;

Другім сур'ёзным недахопам газеты з'яуляецца вузкасць яе тэматыкі. Дарэчы, гэта характэрна у той ці іншай меры для усіх нашых інтэрнацкіх газет. Бывае, што у адным і тым-жа нумары некалькі матэрыялау змешчаны на адну тэму, рэдкалегія не заікнецца аб іншых баках жыцця студэнтау. Гэта у найбольшай меры адносіцца да газеты «Наш быт» (орган студкома інтэрната № 1).

Тое, што тут выпушчана усяго толькі два нумары (апошні нават не быу вывешаны), і беднасць тэматыкі павінны звярнуць на сябе самую сур'ёзную увагу. Доугі час газета зусім не выходзіла. Рэдкалегія у складзе 7 чалавек бяздзейнічала. І толькі напярэдадні новага года выпусцілі... першы нумар. Чым-жа ён запоунен?

Далёка не поунасцю адлюстроуваюць жыццё і быт студэнтау газеты у інтэрнатах па вуліцах Няміга, Бабруйскай (корпусы «А» і «Б»). Тут выпушчана толькі ад аднаго да трох нумароу (і гэта з пачатку навучальнага года!).

Не вабяць многія нумары газет і сваёй мовай. Тут можна часта сустрэць зусім незразумелыя або няправільна пабудаваныя выразы і сказы. Напрыклад, ніяк нельга зразумець такі сказ:

«Так было в комнате № 45, где часто бывают всякие торжества, и я не хочу сказать, девочки, забрасывают корридор горою окурков» (Наш быт», № 1, орган студкома інтэрната № 1).

Прафкому, студсоветам інтэрнатау у найкарацейшы тэрмін неабходна выправіць работу рэдкалегій газет, дабіцца таго, каб газеты сталі надзейнымі памочнікамі у справе выхавання студэнтау.

**В. МІХАЛЕНКА.**

# Літаратурная старонка

## У АДЗІН ВЕЧАР

*(АПАВЯДАННЕ)*

... Іван ходзіць па пакою і штосьці ціханька насвістае—сумнае і працяглае. У пакоі—ён адзін. Толькі ложкі бялеюць у прадвячэрнім змроку, туляцца да сценак. Хлопцы разышліся, хто куды... Мішка з Нілам—у кінотэатр, мабыць. Васіль... У гэтага вечары нарасхват! Учора ён недзе ў медычак гуляў, сёння збіраўся да зямлячкі-імянінніцы. І адкуль толькі тыя «зямлячкі» бяруцца? Вунь і на курсе яго нейкім цудам лічаць...

Іван падыходзіць да акна. З другога паверху добра відаць вуліцу. Сіні змрок непрыкметна хутка залівае снегавую бель, зацямняе інстытуцкі сквер. Трэці тыдзень пайшоў, а ад Анюты—ніводнага ліста, ніводнага радка... Захварэла? Усёроўна, за гэты час хоць слова магла-б паведаміць, а то—ні слыху, ні духу. Колькі лістоў ёй Іван «без чаргі» паслаў! А зараз вырашыў не пісаць, хопіць! Усё-ж і ў яго ёсць свой гонар. Але ад гэтага лягчэй не стала. І Іван засумаваў. Нават хлопцы прыкмячаць пачалі. А учора агульнапрызнаная жартаўніца курса Валька Пінчук на смех узняла:—«Ой, глядзіце, дзяўчаткі, наш праформ закахаўся! І нос павесіў клювам... Няхай-жа грамадскі дзеяч дасць тлумачэнне!» Ну, канешне, Іван не стаў «тлумачыць», пастараўся аджартавацца, што сохне па той-жа Вальцы, але на сэрцы ад хітрых, насмешлівых вачэй дзяўчыны зрабілася яшчэ больш непрыемна і моташна.

...Іван уключыў святло і сеў за стол. Падсунуў да сябе нейкую кнігу, але чытаць не стаў. Рука міжволі выцягнула з нагруднай кішэні апошні ліст Анюты. Змест яго ведаў ён напамяць. Добры, сяброўскі ліст. Як заўсёды, напісан у вясёлым паспешлівым тоне, ласкава і разумна. Але было ў ім такое, што прымушала Івана непакоіцца і сумнявацца. У канцы ліста, быццам між іншым, Анюта пісала, што пазнаёмілася... з сынам гаспадыні, які нядаўна вярнуўся з арміі і «смешны вельмі, жартаваць любіць». Іван задумліва павярцеў змяты канверт, невыразна чмыхнуў і раптам сярдзіта сунуў назад у кішэню.

«Вось чорт!—вырвалася нечакана само сабой.—Чаго добрага, рэўнаваць'шчэ пачнеш...» А што, калі і на самай справе яна забыла аб ім?

Забыла? Іван усхвалявана устае ад стала і нібы зноў адчувае той развітальны—першы ў яго жыцці—доўгі і пякучы пацалунак Анюты ў тамбуры вагона, бачыць яе вялікія, прыцененыя густымі расніцамі, журботныя вочы, маленькія і прыпухлыя, як у сямігадовай сястры губы, чуе мяккі дрыготны пошэпт: «Пішы, абавязкова пішы, чакаць буду...» Вось табе і пішы!

Раптам моцна грукатнулі дзверы, аж пляшкі з-пад кефіру ў тумбачцы зазвінелі... І не паспеў Іван павярнуцца, як ужо пачуў голас Васіля.

— Ну, дружышча, марозец, скажу я табе,—жалеза калёнае!—прыгаварваў вясёла ён, скідваючы асенняе паліто.

Твар яго расчырванеўся з марозу і нагадваў нешта медзяное. Толькі доўгі нос, як звычайна, быў сіні і заліхвацкі тырчэў з-пад насунутай на самыя вочы вушанкі.

— Ты што, з імянін?—хмурна спытаў Іван.

— Ды не, не пайшоў, другая справа была...

Васіль вагкавата апусціўся на ложак, са смакам пагойдаўся на старых папіскваючых пружынах.

— А наконт марозу — пустое! Сорак градусаў на дварэ ды сорак за гальштук, а? І быццам вясной—цёпла і весела! Здорава?

Задаволены гэтым, недзе чутым ім жартам, Васіль гучна і, як артыст, штучна зарагатаў, але зірнуў на Івана і адразу змоўк.

— Ты што гэта... Такі, нібы грошы згубіў ці не абедаў, га? А-а, мабыць, усё наконт дзяўчынкі гэтай, як яе, бядуеш?—дабавіў ён, счакаўшы трохі.—Пісямца і сёння няма?

І галава яго дагадліва ускінулася угору, а з вачэй сыпануў сноп насмешлівых іскраў.

— Ды якая табе справа? Вечна ты суеш свой нос,—раззлаваўся Іван і рэзка павярнуўся да Васіля.—А калі і няма, дык што?

Васіль з ледзь прыкметнай усмешкай схіліў галаву, нібы аб нечым намагаючыся успомніць. Потым рашуча устаў ва увесь свой рост і ўжо спачувальна паглядзеў на Івана.

— Ты не сярдуй, бывае... Я то ведаю з чым гэтае ліха хлябаюць, а толькі скажу табе, Ванька, прама: усе бабы на адзін манер шытыя, усе. Ды не яршыся, слухай лепш...

Васіль дастаў папяросы, вынуў адну, паволі размяў яе ў пальцах, пастукаў аб карабок.

— Вось ты ўлюбіўся... Глядзіш на яе і ўся яна здаецца табе прыгажуняй з прыгажунь, быццам зорка якая! Так? Толькі усё гэта—пустнейшы міраж, глупства, адным словам. Я другімі вачыма гляджу: нават самая лепшая дзяўчына цэліць скруціць нашага брата, не празяваць, як кажуць, моманту. Ну і сцямлівай вось. Ты з'ехаў, другі з'явіўся... Можа і любіла цябе, ды толькі што ёй карысці чакаць: лепей варабей у руках, чым сініца ў небе! Зразумеў? Вось яно як! А ты тут, Ванька, чакай...

Васіль гаварыў, а Івану здавалася, што сядзіць ён у старэнькай заезджанай паўтаратонцы, якая на ўсіх сваіх скорасцях імчыць па лясной, ухабістай дарозе: яго бязлітасна кідае ў розныя бакі кузава, галіны стрэчных дрэў балюча сцябаюць па твару, а ён, Іван, імкнецца і ніяк не можа выскачыць....

Хочацца абарваць Васіля, сказаць, што той ілжэ, што не такія дзяўчаты, не такая Анюта, крыкнуць яму што-небудзь непрыемнае, зневажаючае, але...

— Карацей кажучы, кніжнага кахання ты тут не шукай, у жыцці ўсё значна працэй. Верыць дзяўчыне—усёроўна, што ў добрае надвор'е: з раніцы ні хмурынкі, а пад вечар... Ды вось, вось табе, і спяваецца не дарма, помніш?

Васіль скамячыў папяросу і, схіліўшыся грудзьмі над сталом, заспяваў, страшэнна блытаючы мелодыю:

Сердце красавицы
Склонно к измене...

— Калі ласка! А яшчэ кажаш... Выкінь ты з галавы гэту, як яе, сваю дзяўчыну. Знойдзем і не такую! Ды не перажывай асабліва, па-сяброўску раю. Яна там, як піць даць, падчапіла каго-небудзь....

Быццам шкляны асколак разануў вуха: падчапіла .. Падчапіла яго Анюта! Іван рыўком ускочыў са стула і гнеўным жалячым поглядам устанавіўся на Васіля.

— Слухай, ты... перастанеш, або я...

— Ну, ну, закіпеў ужо,—прымiраючы заусміхаўся Васіль.—Кінь, пойдзем лепш павячэраем па-чалавечаму!.. Пойдзем? Не сумнявайся, грошыкі ёсць—мой шаноўны бацька выслаў-такі. Ды і прычына грунтоўная: бачыш, пальчаткі якія раздабыў?

І закахана патрасаючы чорнай скуранай пальчаткай, ён гарэзліва дадаў:

— Цэлы год шукаў... Хіба-ж не варта замочкі? Глядзі!

Іван не стрымаўся, усміхнуўся. Васілю было абыякава, што замачваць, за што выпіць... Аднойчы нават шасцірублёвыя шкарпэткі замачваў. Як-жа, творчая выдумка!

Васіль усё гаварыў... Цяпер ён ужо са смакам апісваў сваё знаёмства з нейкай афіцыянткай, яе выключную фігуру і трэпяткі нос....

Але Іван не прыслухоўваўся. «Можа і сапраўды пайсці павячэраць,—думаў між тым ён.—Абедаў рана, ды і настрой...» І ўжо без ваганняў ён стаў завязваць шалік.

Каля выхаду з інтэрната затрымаліся. У апошні раз безнадзейна пакорпаўся Іван у рознакаляровых канвертах на століку, за якім сядзела пажылая жанчына-швейцар. Ён нават не заўважыў цёплы спачувальны погляд старой. Ліста не было.

— Дробны, нібы апілкі, сняжок адразу абсыпаў іх на вуліцы. Здавалася, што гэта іней з галін нейкага велізарнага дрэва сыплецца. Васіль, як заўсёды, нешта расказваў з сваіх незлічоных прыгод, а Іван ішоў маўкліва і толькі звыкла пакусваў ніжнюю губу. Ён думаў аб усім, аб чым можна было думаць: аб Анне Міхайлаўне, заўтрашніх лекцыях... Але Анюта не выходзіла з галавы. І ўжо зусім па-другому глядзеў Іван на Васіля. Уся прадузятасць наконт яго довадаў выглядала пустой падазронасцю. «Чалавек ён—у гадах,—разважаў Іван,—нават жанатым, кажа, быў... Чаму-ж яму не верыць у гэтых справах? А сардэчнасць, з якой ён угаварваў не хвалявацца Івана? Гэта-ж і ёсць сяброўская падтрымка».

Цяпер, пасля слоў Васіля, Івану здавалася, што ён, Іван, сапраўды корчыць з сябе рыцара нейкага... такая дзявочая вернасць? Як той Васіль кажа: надвор'е... І усё-ж было да прыкрага крыўдна за сябе, за Анюту. Напісала-б прама: закахалася ў сына гаспадыні і—усё, а то 'шчэ...

Тонка паскрыпваў снег. Жоўтае ліхтарнае святло падала на тратуар, вырываючы са змроку вечара твары пешаходаў. У Івана была звычка—лавіць гэтыя твары, разглядваць іх і пра сябе вырашаць, што за чалавек... Але зараз яны здаваліся яму фатаграфічна падобнымі. Раптам нехта схапіў Івана за локаць і амаль у самае вуха, крыкнуў:

— Ды стойце-ж вы, нарэшце!

Хлопцы здзіўлена спыніліся: Байчэнка! Што гэта ён, адкуль? А той ужо сыпаў словы, як гарох:

—Бачу, па лесвіцы спускаешся... Ну, думаю, зараз апрануся і дагоню. А пакуль апрануўся... Добра, што хоць тут нагнаў!

— Слухай, што з табой? Нібы з ланцуга сарваўся,—не асабліва ветліва перабіў яго Іван.

— А вы, грамадзянін, пацярпіце крышачку, даведаецеся... Па-першае, сёння на гуртку англійскай мовы табе даручылі да вечара падрыхтаваць урывак з Шэкспіра, па-другое...

Байчэнка нарачыта паволі, не спяшаючыся даставаў нешта з кішэні паліто. Вось Іван убачыў сініваты ражок, болей, болей і, нарэшце...

У той-жа момант Іван здагадліва кінуўся да Байчэнкі, схапіў яго за руку і здаўленым ад узбуджэння голасам, прагаварыў:

—Ліст? Мне? Давай, давай сюды, чуеш...

— Ды табе-ж, табе-ж,—лагодна засмяяўся Байчэнка,—толькі руку пусці, мядзведзь, на аўтобус спазнюся...

Іван тут-жа разарваў канверт, падсунуўся бліжэй да ліхтара. Прыгожы — выпуклымі роўнымі кружочкамі—почарк Анюты замітусіўся ў вачах, заскакаў літарамі. Губы пашавельваліся ў лад словам, стрымліваемая усмешка радасці зломлівала іх у куточках і, як рака ў лёдаход, нарэшце прарвалася, заліла увесь твар... А Васіль стаяў побач, рабіў выгляд, што ніколькі не цікавіцца лістом, але не вытрымаў, зазірнуў праз плячо Івана і, як-бы нехаця, кінуў:

— Што яна там залівае, твая Венера? Мабыць... Так і ёсць, была, хворая, піша... Бабская хлусня! Э-э, пойдзем.

Беражліва, як ёлачную цацку, Іван асцярожна схаваў ліст на грудзі і толькі тады павярнуў твар да Васіля. Адно імгненне іванавы вочы зіхацьнулі бляскам вострага абурэння, пагардлівасці. Але ўся невыказаная крыўда, якую цяпер ён адчуваў да Васіля, так-жа раптоўна рассеялася, як і узнікла. Доўгавязая фігура аднакурсніка выклікала толькі жаль ды адчуваўся нейкі непрыемны асадак ад мінулага—сорам за сябе, за сваю даверлівасць.

— Нікуды я з табой не пайду,—прамовіў Іван амаль звычайным незлослівым голасам.—Замачывай ты сам свае пальчаткі, маралiст!

І Іван пакрочыў ціхай хадой у бок інстытута. Думкі яго радасна мітусіліся, а сэрца-маятнік гулка і пераможна адстуквала вечную песню закаханых, па-маладому ірвалася з шырокіх грудзей насустрач усяму добраму ў жыцці.

**Яўген КАРШУКОЎ.**

## КАЛІ ТЫ ЗАЖУРЫЎСЯ, ТАВАРЫШ...

*Плаўна кружацца, кружацца*
*пары,*
*Гукі вальса напоўнілі зал...*
*Калі ты зажурыўся, таварыш,*
*Дык прыходзь на студэнцкі*
*баль.*

*Уступі толькі ў круг наш*
*цесны,*
*Паглядзі на сяброў сваіх,*
*Падхапі задорную песню —*
*І твой сум прападзе ўміг.*

*Сёння хай паляжыць закрытым*
*Важкі том навуковых прац.*
*Сёння ў светлы наш зал ідзі ты*
*І па танцах экзамен здаваць.*
*І хоць, можа, тут «два»*
*паставяць,*

*Ты не бойся выйсці на круг:*
*Ні стыпендыі тут не*
*пазбавяць,*

*Ні на сходзе не разбяруць.*
*Галаву апускаць не варта,*
*Весялей сябе, дружа, трымай,*
*Бо навокал свае усе рэбяты—*
*Ні «стыляг», ні пiжонаў няма.*

*Без сяброўкі прышоў ты,*
*можа,*
*Не паспеў закахацца яшчэ—*
*Тут нямала дзяўчат*
*прыгожых,*
*Заўважай, хто пяе званчэй.*
*Запрашай яе ў круг шырокі—*
*І ўпаўне магчыма, мой друг,*
*Што сюды ты ішоў адзінокім,*
*А адсюль, можа, пойдзеш*
*ўдвух...*

*Дык хай кружацца, кружацца*
*пары,*
*Гукі вальса хай поўняць зал!..*
*Калі ты зажурыўся, таварыш,*
*То прыходзь на студэнцкі*
*баль.*

**Генадзій БУРАЎКІН.**

* * *

Я песню ў сэрцы табе складаў
Гадамі радкі выношваў.
Да кроплі, што меў і што мог, аддаў,
Каб песня была харошай.

Найлепшыя думкі—мары свае
(Свае—чужых не выпрошваў!)
Любоўна ўплятаўся ў тканіну яе,
Каб песня была харошай.

Лясы-пералескі, дубровы, гаі
З бярозамі ў чорных прошвах
У сэрцы маім пад ветрам гулі,
Каб песня была харошай.

І зманлівы пах даспелых суніц
І водар лугоў някошаных
Стараўся я ў песню сваю ўсяліць,
Каб песня была харошай.

Ад першага дня, як стрэціў цябе,
Радкі шліфаваў я ўвішна...
І як-жа мне радасна знаць цяпер,
Што песня нядрэннай выйшла!

**Ніл ГІЛЕВІЧ.**

## МАЕ ПАДАРУНКІ

Да бацькоў я ў дні канікул ехаў
І рашыў: куплю ім патэфон.
Думаў: вось дзе будзе ў вёсцы уцеха,
А дзядуля будзе як здзіўлён!
Толькі-ж дзед гаворыць мне з хітрынкай,
Ледзь крануўшы кончыкі вусоў:
— Добра усё, ды вось—адну пласцінку
Перакручвай некалькі разоў.
А цяпер—от у Сымона Брагі—
Штука ёсць, што толькі паглядзі:
Сядзь, лаві Маскву, Пекін ці Прагу,
З цэлым светам гутарку вядзі!
Ну, і я пасля маіх канікул
Парашыў: сюрпрыз яму зраблю!
І з сваёй палучкі невялікай
Адкладаў—з дзесяткі па рублю.
І збіраў я гэтак месяц кожны:
Вось цяпер то, думаў, падару!
І праз пару год нёс асцярожна
Новенькі прыёмнік «Беларусь».
Бачу: дзед над ім і прападае,
З светам пераклічку усім вядзе.
— Ну, дык як?—з усмешкаю пытаю.
— Так, нядрэнна, унучак,—кажа дзед,—
Толькі-ж, бач, каго-б сабе не вызваў,
Не відаць тут—усяго й бяды...
— Ладна-ж, дзед, куплю вось тэлевізар,
Паглядзім, што-ж скажаш мне тады!

**Кастусь ЦВІРКА.**

## СТУДЭНЦКІ ЧАМАДАН

Можа хто і пасмяецца з верша:
Вось хлапец знайшоў здзівіць чым свет!
Толькі-ж гэтак я кажу не першы:
— Чамадан мне—як курцу кісет.

Паглядзі—чаго няма ў ім толькі:
І Купалы кніжка, і Бальзак,
Тут буфет студэнцкі мой, паколькі
Без яго не пражывеш ніяк.

Праўда, як стыпендыя знікае—
І буфет тады пусцее ўміг,
Бо ніхто ў нас не замыкае
Скарб няхітры ад сяброў сваіх.

А калі машынай спадарожнай
Я дамоў імчу на пару дзён,
Хіба-ж мне без чамадана можна?
Дазарэзу тут патрэбен ён:

Па дарозе дрогкай газік скача—
Чамадан мой крэслам можа быць.
Тут і пашанцуе мне, няйначай,
Для дзяўчыны месца уступіць.

А дамоў прыедзь—маленькі брацік
Завіхацца ля яго пачне—
Самы заклапочаны ў хаце,—
Каб знайсці у ім што пасмачней...

Так заўжды, дарогаю-б якою
Мой студэнцкі лёс мяне ні вёў—
Чамадан той я вазьму з сабою,
Як багацце першае сваё.

Не бяда, што крыху абшарпаны,
Але-ж служыць ён не толькі мне.
І на бляск пузатых чамаданаў
Я яго не прамяняю, не!..

**Васіль ЗУЁНАК.**

Рэдактар А. ВОЛК.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, пакой 62, тэл. 2-07-19
АТ 02961 Друкарня выдавецтва БДУ. ЗАК. 380 Тыраж 2000